**Смыслова, Л. В.** Клубныя ўстановы / Л. В. Смыслова // Памяць: Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.] ; уклад. М. М. Кірпіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Белта, 2003. – С. 516–517.

## КЛУБНЫЯ ЎСТАНОВЫ

У канцы XX ст. на Ушаччыне працавалі 23 дзяржаўныя клубныя ўстановы. Гэта раённы Дом культуры, 5 сельскіх дамоў культуры, аўтаклуб, 14 сельскіх клубаў, Дом рамёстваў і гарпасялковы клуб.

На працягу 1999 г. у клубных установах раёна працавала 39 культработнікаў. З іх вышэйшую адукацыю па культуры і мастацтву мелі 6 чалавек, сярэднюю спецыяльную – 17.

У клубных установах раёна створаны 88 клубных фарміраванняў-гурткоў мастацкай самадзейнасці і клубных аб'яднанняў (усяго 951 чалавек). Удзельнікі гурткоў мастацкай самадзейнасці заўсёды прымаюць удзел у раённых святах, такіх, як «Грай, гармонік!», «Восеньскі кірмаш», «Масленка» і іншых. Добра вядомы ў нашым раёне сямейны ансамбль Гуськовых, які працуе пры Дубраўскім СДК. Гэты калектыў быў у ліку пераможцаў абласнога агляду-конкурсу сямейнага мастацтва «Сузор'е талентаў» у г. Сянно ў лістападзе 1999 г. Пры сельскіх дамах культуры і клубах працавалі 10 вакальных груп, дзе займалася 100 удзельнікаў, 11 драматычных калектываў, гурткі мастацкага чытання, сольнага спеву, вышывання, гурткі маладых паэтаў, 11 аматарскіх аб'яднанняў (125 чалавек). Раённы клуб «Смак» два гады (1997, 1998) прадстаўляў ушацкія прысмакі на Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар» у Віцебску.

У 1999 г. у раёне працавалі 4 фальклорныя калектывы. Аўтэнтычны калектыў Матырынскага СДК добра вядомы не толькі ў раёне, але і ў вобласці. Калектыў аднавіў абрад «Радзіны» нашага краю. Ён захоўвае рэгіянальныя песні народнага календара і песні сямейнай абраднасці, старадаўнія танцы, мае спадарожніка – дзіцячы фальклорны калектыў. Дзеці з цікавасцю вывучаюць старадаўнія народныя танцы, песні, гульні.

У раёне вядзецца работа па вывучэнні мясцовага фальклору. Пры метадычным цэнтры маецца фанатэка. Праводзяцца народныя святы Каляды, Купалле, Багач, Юр'я і інш. Мосарскі сельскі клуб супрацоўнічае з краязнаўчым музеем Мосарскай школы, у якім захоўваюцца рэчы побыту мясцовых жыхароў.

З мэтай адраджэння і захавання традыцыйных рамёстваў у нашым раёне быў створаны Дом рамёстваў. Пэўная работа вядзецца клубам майстроў Ушацкага РДК, які цесна працуе з сельскімі ўстановамі культуры.

Дзейнасць клубных устаноў раёна адпавядае гадавому плану работы, які ўключае ў сябе ўсе каляндарныя і народныя святы, святы вёсак, творчыя вечарыны, тэматычныя вечары, вечары адпачынку, работу гурткоў, работу па развіцці і адраджэнні традыцый беларускай нацыянальнай культуры, выкананне рэспубліканскіх праграм «Па рабоце з моладдзю», «Работа з інвалідамі, адзінокімі і састарэлымі», «Комплексная праграма «Сям'я», «Жанчыны Рэспублікі Беларусь».

У мэтах больш эфектыўнага выканання планаў работы сельскімі ўстановамі культуры ў 1994 г. быў створаны раённы метадычны цэнтр, які ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва клубнымі ўстановамі раёна, аказвае якасную дапамогу ў распрацоўцы метадычных матэрыялаў, арганізацыі масавага адпачынку працоўных і культурнага абслугоўвання насельніцтва.

**Л. В. Смыслова**